ЮБІЛЕІ

# ЧЫТАЕ СВЕТ ЯГО ВАЙНУ:

## 100-ГОДДЗЕ ВАСІЛЯ БЫКАВА

“Чытае свет яго вайну”, – так напісала пра Васіля Быкава вядомая паэтка Данута Бічэль у сваёй кнізе "Хадзі на мой голас". Быкаў пражыў у Гродне 25 гадоў. Данута Янаўна светла ўспамінае тыя гады і прызнаецца, што "праўда такая, што пачала пісаць (пра свайго настаўніка) ужо тады, калі прыехала ў Гародню", калі паступіла ў Гродзенскі педагагічны інстытут імя Янкі Купалы (1958 г.) і дадае, што любіла сваіх літаратурных настаўнікаў усім сэрцам і "дзялілася гэтай любоўю з усім светам". Гэта так. Мне таксама выпала шчасце быць надзеленай гэтай любоўю. Менавіта дзякуючы Дануце Янаўне адбылося маё знаёмства з Васілём Быкавым.

Быў пачатак жніўня 1971 года, я толькі закончыла ўніверсітэт і прыехала працаваць настаўніцай у свой родны Слонім. Чарговы раз зайшла ў рэдакцыю нашай раённай газеты, дзе працаваў мой паэтычны настаўнік Анатоль Іверс. Ён сказаў, што ўжо меўся мяне расшукваць, бо якраз перад маім прыходам патэлефанавалі з Гродна, з тэлебачання і запрасілі прыехаць на запіс перадачы. Ужо калі прыехала, у тэлестудыі сустрэла Дануту Бічэль. Я ведала яе па здымках і вершах, бачыла на пісьменніцкіх імпрэзах у Мінску. Пагаварыць нам не далі, бо адразу пачалі рыхтаваць да запісу. Затое пасля яна адразу ўзяла мяне пад сваю апеку – прапанавала пайсці да Васіля Быкава ў рэдакцыю, паказаць яму мае вершы, расказала, што ён укладае літаратурныя старонкі. Яе зычлівая прыхільнасць, апякунства ўсцешылі мяне, бо ў Гародні на той час не мела знаёмых. Ды і перспектыва сустрэцца са знакамітым пісьменнікам непасрэдна, паразмаўляць, уяўлялася найшчаслівейшым выпадкам.

Рэдакцыя "Гродзенскай праўды" тады знаходзілася на вуліцы Паліграфістаў. Помніцца, што ў пакоі, куды мы зайшлі, мелася некалькі сталоў, а заняты былі толькі два: за адным сядзеў Васіль Быкаў, а насупраць – жанчына. Было відаць, што Данута пачувалася тут сваёй. Быкаў устаў, прыветна павітаўся, запрасіў сесці, падставіўшы яшчэ крэсла, бо каля яго стала было толькі адно. Данута прадставіла мяне. Пачуўшы, што я са Слоніма, Быкаў зазначыў, што слонімскую зямлю можна назваць вельмі спрыяльнай для літаратараў і літаратуры, і запытаўся, ці кантактую я з Анатолем Іверсам. Гэта пытанне зняло маю скаванасць – лягчэй гаварыць пра кагосьці, тым больш пра значнага для цябе чалавека. Да таго ж падбадзёраная яго добрым, спакойным позіркам я распавяла не толькі пра Іверса, а і ўвогуле пра слонімскія літаратурныя справы. Данута падключылася да размовы, расказала пра наша выступленне на тэлебачанні.



Калі згадаць афарыстычнае выказванне, што ўменне слухаць – гэта адна з каштоўных рыс чалавека, то Быкаў напоўніцу валодаў гэтым уменнем. Ён слухаў эмацыйна стрымана, але ўважліва, з непадробным стаўленнем да таго, пра што вялася размова. Адчувалася, што ў яго не было звычкі падладжвання. Гаварыў адкрыта і шчыра. Трымаўся проста, безуважна ставіўся да таго, што ўспрымаюць яго як літаратурную зорку. Як пазней слушна напіша Данута Бічэль, Быкаў не зважаў на "німб славы, які ўжо ззяў над яго сціплай галавой". А тады яна пацікавілася, калі плануецца літаратурная старонка, аддала свае вершы і некалькі маіх. Яшчэ ідучы ў рэдакцыю мы абмеркавалі і вершы, і маё працаўладкаванне. Якраз пра яго і пачалі размову з Быкавым. Данута Янаўна сказала, што настаўніцкая праца мала спрыяе напісанню вершаў, можа б лепей у рэдакцыі газеты працаваць. Быкаў пагадзіўся, але зазначыў, што яна ж два паэтычныя зборнікі выдала і ўжо трэці рыхтуе, а ў рэдакцыі, асабліва раёнкі, зусім не лягчэй, тоўстыя ж часопісы, дзе ўмовы больш спрыяльныя, ёсць толькі ў Мінску, але там вольных месцаў няма. У школе хоць нейкія адтуліны: канікулы ды і цэлае лета, да таго ж Слонім не бедны на культурнае жыццё і творчых людзей, і калі ўжо мяняць гэты горад, то толькі на Гародню. Ён згадаў, што служыў у вайсковай часці, якая знаходзілася паміж Слонімам і Альбярцінам (цяпер мікрараён Слоніма, а вайсковую часць перавялі адтуль яшчэ ў шасцідзесятыя), пасля прыгадаў сустрэчу з чытачамі ў Слоніме, з Алегам Лойкам. Я крыху асмялела і пахвалілася, што з першага курса была ў літаб'яднанні "Узлёт", якім кіраваў Алег Антонавіч. Помніцца, што Быкаў гэта ўхваліў, але нагадаў пра неабходнасць падвышацца самой і клапатліва параіў цвёрда адбівацца ад неабавязковага, бо яно з'ядае час, а яшчэ не парываць сувязі з Мінскам, не даваць на сябе забыцца – нешта з напісанага дасылаць па

пошце, ды часцяком наведвацца ў рэдакцыі, нагадваць пра сябе. Тут ужо Данута Янаўна далучылася да пажаданняў, парадзіўшы найперш на Гародню не забывацца. Васіль Уладзіміравіч у тон ёй пацвердзіў, што канешне ж у Гародню варта прыязджаць у першую чаргу. Пасля ўжо сур'ёзна дадаў, што плануецца ў хуткім часе семінар, і ён запросіць мяне праз Івана Дарафеевіча (Анатоля Іверса). Я падзякавала, і мы паспяшаліся развітацца, бо яшчэ да майго ад'езду Данута Янаўна прапанавала схадзіць да Каложы.



Слова ж сваё Быкаў стрымаў. Я атрымала запрашэнне на семінар у дом Элізы Ажэшкі, там размяшчаўся офіс Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў, а Васіль Быкаў ужо стаў яго сакратаром.

А ў той дзень, едучы дадаму, я мела двастае пачуццё: з аднаго боку поўнілася радасцю ад таго, што так нечакана пашчасціла пасядзець поруч і паразмаўляць са славутым празаікам, цешыла непадробная ўвага да маіх трывог і чаканняў, шчырая падтрымка. І адначасова адчувала прыкрасць, што не перавяла размову з сябе, хаця ўдзячна была за ўвагу і клопат. Найбольш злавала на сябе, што не адважылася, як хацела, распытацца пра герояў так узрушыўшай мяне аповесці "Жураўліны крык", не даведалася, як узнікла задума твора, як былі выбраны яе персанажы. Я нібы падсвядома прадчувала, што прыдзецца мне разважаць пра лёсы гэтых літаратурных герояў ужо з маімі вучнямі.

Знаёмства з творчасцю Васіля Быкава ў школе пачалося пасля выхаду на экраны фільмаў "Трэцяя ракета" (1963) і "Альпійская балада" (1966). Першапачатковa адбывалася гэта знаёмства па ініцыятыве саміх настаўнікаў на ўроках пазакласнага чытання ці ў межах раздзела "Тэма вайны ў сучаснай беларускай прозе". Вядомасць, якую прынеслі пісьменніку гэтыя творы, і ўзнагароджанне Літаратурнай прэміяй імя Якуба Коласа прадвызначылі ўключэнне выдатнага празаіка ў школьныя праграмы. А вучняў адразу ж захапіў яго магутны талент і бескампрамісная сумленнасць у адлюстраванні вайны, якую пісьменнік называў самым праклятым "з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі". Падлеткаў прываблівалі і самі формы працы над быкаўскімі мастацкімі тэкстамі, што патрабавалі ўдумлівага чытання і разважання. Падаваўся ў школьных падручніках і крытычны матэрыял да твораў Васіля Быкава, але самі творы пісьменніка ў гэта пракрустава ложа ніяк не ўціскаліся і сваім трагізмам узрушвалі думкі і пачуцці вучняў-чытачоў, выклікаючы жаданне выказацца, нават падыскутаваць, а не проста абмежавацца аналізам з падручніка.

Аповесць "Жураўліны крык" – адзін з першых твораў, які пачаў глыбока вывучацца на ўроках беларускай літаратуры. Помніцца, што мяне ўзрадавала з'яўленне гэтай аповесці ў школьнай праграме па літаратуры і прымусіла пашкадаваць яшчэ раз аб нерэалізаванай магчымасці пачуць пра яе словы самаго аўтара.

Метадычныя распрацоўкі з'явіліся не адразу, і, як прыгадваюць настаўнікі з вялікім стажам працы, што ўжо казаць пра мяне, маладую настаўніцу, даволі часта прыходзілася адкладваць падрыхтаваны план, дзе ўсё падпарадкоўвалася звыклай (да таго ж і правільнай) канцэпцыі пра ўслаўленне мужнасці і гераізму, і ўключацца ў дыскусію, якую стыхійна распачыналі вучні, аналізуючы эпізоды, характарызуючы і параўноўваючы вобразы-персанажы. А прычынай таму было вялікае псіхалагічнае майстэрства В. Быкава ў паказе абставін і характараў. І нават такі "малазначны" на думку вучняў кампанент кампазіцыі, як пейзаж, успрымаўся з напружанай увагай, бо ён, як правіла, лаканічны, гранічна знакавы і неяк фізічна адчувальны. Калі вучні зачытвалі апісанне: "Сумны восеньскі адвячорак поўніўся шэрасцю фарбаў, надакучлівай сцюдзёнай золлю і ўсёабдымнай трывогай навіслай над краем бяды", ім перадавалася адчуванне напружанасці, непрадказальнасці ўмоў, у якіх аказаліся байцы. Лаканічнае, але вельмі выразнае, запамінальнае, як гэта заўсёды робіць пісьменнік, прадстаўленне герояў адразу ж прыцягвала ўвагу васьмікласнікаў. І перад імі паўставала ўжо не шэсць літаратурных персанажаў, а шэсць байцоў, перад якімі стаіць жорсткая па відавочнай невыканальнасці задача затрымаць на суткі ворагаў, перакрыць ім дарогу на невялікім чыгуначным пераездзе. І думкі, і ацэнкі ў вучняў паўставалі розныя. Цікава, што васьмікласнікі стараліся знайсці станоўчыя рысы характару ва ўсіх герояў аповесці "Жураўліны крык". Але ў працэсе ўважлівага прачытання ды аналізу твора іх меркаванні змяняліся. Так, пасля першага знаёмства найменшы рэйтынг, калі можна так сказаць, у

неабстрэленага Глечыка і Свіста, ”белабрысага, расшпіленага на ўсе кручкі і гузікі, жулікаватага з выгляду хлопца”. Пасля знаёмства з іх біяграфіямі погляды мяняюцца, і зніжаецца планка Аўсеева. Калі перагортваецца апошняя старонка аповесці, вострая дыскусія ўзнікае толькі адносна Пшанічнага. Яго жыццё, напоўненае несправядлівасцю з-за таго, што ён, сын кулака настройвае дзяцей на спачуванне; яго філасофія “сам сабе, сам для сябе, наперакор усім” – вынік зацкаванасці і загнанасці з-за ўсё той жа плямы сына кулака выклікае ў вучняў насцярожанасць; яго адмежаванасць ад тых, хто з ім поруч на гэтым трагічным рубяжы, яго паводзіны, думкі пра вайну і ўрэшце здрада абуджаюць цэлую гаму пачуццяў. Як правіла, разгаралася актыўная дыскусія. Адны спрабавалі апраўдаць Пшанічнага, другія – катэгарычна асуджалі.

Згадваю сваю разгубленасць. Я разумела, што проста стаць на бок асуджаючых, узброіцца цытатай з падручніка зусім не будзе значыць, што апраўдваючыя зменяць сваю пазіцыю. Процістаянне застанецца. Неяк само па сабе узнікла праблемнае пытанне: “А што было б, каб немцы не забілі Пшанічнага?” Агучыла яго вучням. Прагнозы выказвалі самыя розныя, але амаль усе адмоўныя. І ўсе ўрэшце без змушэння прыйшлі да згоды з аўтарскай пазіцыяй, што хаця драма Пшанічнага варта жалю і спачування, аднак апраўдання здрадзе няма.

Пазней былі ўключаны ў школьныя падручнікі аповесці "Сотнікў" і "Знак бяды", якія таксама выклікалі дыскусійныя сітуацыі, бо падлеткаў узрушвалі быкаўская вобразы, прымушалі ўчытвацца ў яго творы.




Чытае свет яго вайну. І мы чытаем яго вайну. Чытаем і захапляемся творчасцю выдатнага пісьменніка-гуманіста Васіля Быкава, які 25 год пражыў у нашай Гародні і надрукаваў у № 100 (1638) "Гродзенскай праўды" ад 22 мая 1949 года сваё першае апавяданне “У той дзень”. Распачаўшы галоўную тэму сваёй творчасці.

**Алена РУЦКАЯ**
літаратуразнаўца,
Заслужаны настаўнік Беларусі,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Выкарыстаны фота з адкрытых крыніц.*